# ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

## Роздум

*Зязюлямі гадоў пракукаваны,*
*бор галавы маёй...*
*Р. Барадулін*

Трывожна і боязна бывае на душы – чамусьці ўсё часцей успамінаецца маленства. Чаму, навошта? І чаму іменна цяпер? І так хораша, жыва паўстаюць у памяці ранейшыя радасць і смутак, і так шкада, як падумаеш, што не вернеш ужо назад ні такой, як тады, радасці, ні такога смутку. А яны ж так трэба цяпер мне: навошта мне, каб радасць, пасталеўшы, стала ціхамірнасцю, а смутак – журбой?

І так трывожна і боязна бывае на душы – няўжо так пачынаецца сталасць?

Было ж і раней у мяне маленства, і раней успамінаў аб ім, але ж мне было так добра з ім, як добра рэчцы ў берагах, а дрэвам у голлі. Дык навошта ж рэчка выходзіць з берагоў і пасля па іх сумуе? Навошта дрэва высока ўгору выносіць свае шаты, навошта сумуе па грыбных зацішках роснай зямлі?

Можа, так і са мной: і шкада, шкада ўжо маленства, і трывожна, боязна за маладую сталасць.

*Міхась Стральцоў*
*1964*